**Сняжкова, І.** З надзеяй на доўгую памяць / І. Сняжкова // Пастаўскі край. – 2021. – 26 мая. – С. 6.

**З надзеяй на доўгую памяць**

***Сёлетняй вясной пастаўскай СШ № 2 прысвоена імя Надзеі Асяненкі. З гэтай нагоды 20 мая ў школе адбылася ўрачыстасць, у якой удзельнічалі не толькі настаўнікі і вучні, але і родныя забітай фашыстамі партызанкі.***



**Падчас урачыстасці**

Госцем мерапрыемства таксама стаў начальнік аддзела па адукацыі Пастаўскага райвыканкама **Павел Трава.** Ён першым звярнуўся да прысутных**:**

**–** *Зусім нядаўна наша краіна святкавала чарговую гадавіну Вялікай Перамогі. Напярэдадні гэтай святой для кожнага беларуса даты другой школе была ўручана копія Сцяга Перамогі. Гэта невыпадкова: на працягу многіх гадоў дырэктар установы Аляксандр Кузняцоў разам з вучнямі вывучае падзеі Вялікай Айчыннай вайны, вяртае з небыцця імёны яе ахвяр. Школьны музей баявой і працоўнай славы ў раёне лічыцца ўзорным і з'яўляецца цэнтрам патрыятычнага выхавання школьнікаў. Таму рашэнне аб прысваенні навучальнай установе імя Надзеі Асяненкі было прынята адзінагалосна і зацверджана на ўсіх узроўнях. Я ўпэўнены, што школа пад новым імем працягне свае слаўныя традыцыі па ўвекавечанні памяці пра загінулых і прымножыць поспехі ў сваёй няпростай і вельмі патрэбнай дзейнасці.*

Павел Трава ўручыў дырэктару СШ № 2 пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі, пасля чаго слова было перададзена нашчадкам Надзеі Асяненкі. Іх на ўрачыстасці прысутнічала трое, і ўсе яны – траюрадныя пляменнікі славутай партызанкі.

**–** *Найперш мы хочам падзякаваць кіраўніцтву школы за запрашэнне на такое значнае і хвалюючае для нашай сям'і мерапрыемства,* – гаварыў **Віктар Тарасаў,** які ў Паставы прыехаў з Мачулішчаў Мінскага раёна.

**–** *Мы ўдзячныя ўсім, хто прымаў рашэнне такім чынам увекавечыць памяць Надзеі Асяненкі. Яна была роднай сястрой маёй бабулі. Дома ёсць кніга, дзе апісваецца дзейнасць Надзеі Міхайлаўны ў гады вайны, захоўваецца і выразка з газеты пра яе.*

*Знакава, што менавіта ў гэтай школе вучылася мая мама Феафанія* (пляменніца Н. Асяненкі **– аўт.).** *Яна вельмі перажывала, што не змагла прыехаць на ўрачыстасць, і перадавала ўсім прывітанне. Мама, як і мы, узрушаная гэтай навіной і спадзяецца, што некалі сама зможа зноў сюды наведацца.*

Прагучалі на ўрачыстасці і шматлікія факты пра партызанку-зямлячку, якая была ўзнагароджана медалём «Партызану Айчыннай вайны» I ступені. Яна нарадзілася ў 1918 годзе ў вёсцы Ліпнікі Пастаўскага раёна. У 1939-м, пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР, прымала ўдзел у калгасным будаўніцтве. Па яе ініцыятыве ў вёсцы была адкрыта хата-чытальня, створана камсамольская агітбрыгада.

У барацьбу супраць ворага Надзея Асяненка ўключылася з першых дзён Вялікай Айчыннай вайны. Ужо ў ліпені 1941 года яна ўзначаліла падпольную камсамольскую арганізацыю, створаную ў роднай вёсцы.

***«Цяпер мы павінны апраўдаць аказаны давер і сваімі справамі даказаць, што школа сапраўды вартая насіць імя нашай гераічнай зямлячкі»*** (Аляксандр Кузняцоў).

*«У снежні 1941 года гестапаўцы арыштавалі камсамольскую групу з вёскі Ліпнікі. За краты трапіла і Надзя. Допыты, жорсткія пакуты, але каты не здолелі нічым прымусіць мужную дзяўчыну сказаць словы праўды, здрадзіць таварышам па агульнай барацьбе. З-за адсутнасці прамых доказаў яе адпусцілі»* (з успамінаў партызана атрада імя Суворава Я.

Пронькі).

27 сакавіка 1944 года 4 разведчыкі, у ліку якіх была і Асяненка, конна адправіліся ў раён Параф'янава. Ім трэба было даведацца, калі з гэтай вёскі ў Мядзел прыбудзе група карнікаў. Каля в. Баяры Слабадскога сельсавета разведчыкі наткнуліся на засаду. Вікенцій Лукашэвіч быў забіты, Мацвей Клебан – цяжка паранены. Каб не трапіць у палон да ворага, ён падарваў сябе гранатай.



**Надзея Асяненка**

Пасля гібелі двух таварышаў Надзея Асяненка даставіла да бліжэйшага хутара трэцяга параненага – Бародзіча. Наказаўшы гаспадару адвезці яго да партызан, сама агнём затрымала гітлераўцаў. Пры спробе заскочыць на каня была параненая ў нагу і ўпала. Тым не менш змагла ўкрыцца за вуглом пабудовы адтуль працягваць змагацца. Калі ў Надзею трапіла яшчэ адна куля, яна страціла прытомнасць. Пасля здзекаў фашысты дабілі параненую партызанку.




…Пасля прысваення школе імя Н. Асяненкі пра яе гераічныя справы тут будуць узгадваць яшчэ часцей. А значыць, яшчэ большая колькасць школьнікаў назаўжды запомніць, колькі мужнасці, гераізму і чалавечай трагедыі стаіць за словам «Перамога».

**Іна Сняжкова.**
**Фота аўтара**